Віталь Уткін

Зьвесткі зь Вікіпэдыі — вольнай энцыкляпэдыі

Вікіпэдыя мае артыкулы пра іншых асобаў з прозьвішчам Уткін (неадназначнасьць).

Вітáль Ýткін (нар. 20 чэрвеня 1965 г., Гомель) — дзяржаўны дзеяч рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў 7-га скліканьня.

Віталь Юр'евіч Уткін	
Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь VII скліканьня	
6 сьнежня 2019 г. — цяперашні час	
Прэзыдэнт:	Аляксандар Лукашэнка
Старшыня адміністрацыі Чыгуначнага раёну г. Гомеля	
2014 — 2019	
Прэзыдэнт:	Аляксандар Лукашэнка
Асабістыя зьвесткі	
Нарадзіўся:	20 чэрвеня 1965 (58 гадоў) Гомель
Дзеці:	3
Адукацыя:	Украінская акадэмія ўнутраных справаў, Акадэмія кіраваньня пры прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь

Біяграфія

Скончыў Украінскую акадэмію ўнутраных справаў па спэцыяльнасьці «Правазнаўства», пазьней — Акадэмію кіраваньня пры прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь па спэцыяльнасьці «міжнароднае права».

Працаваў маляром.

З 1984 па 1986 гг. служыў у савецкіх унутраных войсках, пасьля чаго працаваў у органах МУС СССР.

З 1993 па 2014 гг. працаваў на розных пасадах у Гомельскім аблвыканкаме.

У 2014—2019 гг. быў старшынём адміністрацыі Чыгуначнага раёну Гомля.

У 2019 г. прызначаны ў склад Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га скліканьня.

Палітычная пазыцыя, скандальныя заявы

Неаднаразова выступаў з абражальнымі заявамі на адрас беларускіх нацыянальных сымбаляў[1][2].

У 2020 годзе падчас кампаніі па выбарах прэзыдэнта публікаваў матэрыялы і рабіў заявы з мэтай дыскрэдытацыі праціўнікаў А. Лукашэнкі[3][4].

Пасьля гвалтоўнага разгону мірных пратэстаў у жніўні 2020 г., якія суправаджаліся масавымі фактамі гвалту і забойствамі грамадзянаў, Уткін удзельнічаў у публічных мерапрыемствах у падтрымку рэжыму Лукашэнкі і сілавікоў. Памочніца В. Уткіна праяўляла агрэсію да журналістаў незалежных СМІ, якія спрабавалі задаць яму пытаньне[5].

У лістападзе 2020 г. Уткін абражаў беларускіх спартоўцаў, у тым ліку алімпійскую мэдалістку Аляксандру Герасіменю за крытыку рэжыма А. Лукашэнкі[6]. Распаўсюджваў кансьпіралягічныя тэорыі пра нібыта агрэсіўныя пляны замежных краінаў супраць Беларусі[7]

У студзені 2021 году заявіў, што перанос чампіянату сьвету па хакеі зь Беларусі, зьдзейсьнены ў адказ на масавы гвалт і рэпрэсіі супраць мірных пратэстоўцаў на працягу беларускага палітычнага крызісу 2020—2021 гг., нібыта матываваны помстай кампаній-спонсараў чампіянату за паразу гітлераўскай Нямеччыны ў Другой сусьветнай вайне[8]. Крытыкаваў Сьвятлану Ціханоўскую за скасаваньне чампіянату[9].

Сям’я

Жанаты, мае трох дзяцей.

Крыніцы

1. ^ Отжиговый депутат из Гомеля увидел в переносе ЧМ по хоккею месть за Вторую мировую, а до этого пытался спасти турнир письмом Третьяку (https://by.tribuna.com/tribuna/blogs/hockey/2859865.html) [Дэпутат-дзівак з Гомля ўбачыў у пераносе чампіянату сьвету па хакею помсту за Другую сусьветную, а перад гэтым спрабаваў выратаваць турнір лістом да Ўладзіслава Трацьцяка] — Tribuna.com, 25.01.2021
2. ^ Виталий Уткин: белорусскому народу предложен политический коктейль из сепаратизма, экстремизма, предательства определённого (https://web.archive.org/web/20210307111754/http://www.ctv.by/novosti-minska-i-minskoy-oblasti/vitaliy-utkin-belorusskomu-narodu-predlozhen-politicheskiy-kokteyl) [Віталь Уткін: беларускаму народу прапанаваны палітычны кактэйль з сэпаратызму, экстрэмізму, здрады пэўнай] — СТБ, 14.09.2020
3. ^ Способность не видеть хорошего или «вирус Тихановского» (http://utkin.house.gov.by/ru/news-ru/view/sposobnost-ne-videt-xoroshego-ili-virus-tixanovskogo-33/) [Здольнасьць ня бачыць добрага, або «вірус Ціханоўскага»] — Афіцыйная старонка дэпутата В. Уткіна на сайце ПП НС РБ, 14 ліпеня 2020 г.
4. ^ Информационный материал для размышления (http://utkin.house.gov.by/ru/news-ru/view/informatsionnyj-material-dlja-razmyshlenija-34/) [Інфармацыйны матар’ял для развагаў] — Афіцыйная старонка дэпутата В. Уткіна на сайце ПП НС РБ, 10 ліпеня 2020 г.
5. ^ Депутат Уткин поддерживает действия ОМОН? (https://flagshtok.info/by/vybary-2020/deputat-utkin-podderzhivaet-dejstvija-omon-a.html) [Дэпутат Уткін падтрымлівае дзеяньні АМАП?] — Флагшток, 10.08.2020
6. ^ Депутат Уткин высказался об Александре Герасимене: «Это и есть предательство» (https://web.archive.org/web/20210303083720/http://www.ctv.by/deputat-utkin-vyskazalsya-ob-aleksandre-gerasimene-eto-i-est-predatelstvo) [Дэпутат Уткін выказаўся пра Аляксандру Герасіменю: «Гэта і ёсьць здрада»] — СТБ, 08.11.2020
7. ^ «Наш Президент не ушёл, как Горбачёв. Он не ушёл — он стал впереди, его все увидели». Мнение Виталия Уткина (http://www.ctv.by/nash-prezident-ne-ushyol-kak-gorbachyov-ne-ushyol-stal-vperedi-ego-vse-uvideli-mnenie-vitaliya) (недаступная спасылка) [Наш Прэзыдэнт не сыйшоў, як Гарбачоў] — СТБ, 03.12.2020
8. ^ Дэпутат: Адмена ЧС па хакеі — помста нам за перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне (https://nn.by/?c=ar&i=267185) — Наша Ніва, 25.01.2021
9. ^ Уткин: Тихановская и компания сорвали с себя маски — что они действительно хотят для белорусского народа (https://web.archive.org/web/20210125145024/http://www.ctv.by/vitaliy-utkin-tihanovskaya-i-kompaniya-sorvali-s-sebya-maski-chto-oni-deystvitelno-hotyat-dlya) [Уткін:

Ціханоўская і кампанія сарвалі зь сябе маскі — што яны сапраўды хочуць для беларускага народу] — СТБ. 24.01.2021

Вонкавыя спасылкі

- Біяграфія на афіцыйным сайце (http://utkin.house.gov.by/ru/byography-ru/) Палаты прадстаўнікоў НС РБ

Атрымана з «https://be-tarask.wikipedia.org/w/index.php?title=Віталь_Уткін&oldid=2315104»